Сядзі і глядзі

# НОВЫЯ СУСТРЭЧЫ З ЛЮБІМЫМІ...

**На сацыякультурным тэлеканале ў бліжэйшыя выхадныя і на наступным тыдні будзем зноў згадваць вялікіх артыстаў, кінатворцаў і зможам пераглядзець іх працы.**

Напрыклад, 20 і 21 ліпеня запланаваны паказ мастацкага фільма «Карнавал» (СССР, 1981 г.), рэжысёрам якога з'яўляецца Таццяна Ліознава. Кінематаграфічны свет сёлета адзначае 100 гадоў з дня яе нараджэння (1924–2011 гг.). Дарэчы, прыхільнікаў творчасці Таццяны Ліознавай таксама парадуюць і на тэлеканале «Расія-Культура», дзе ў суботу днём пакажуць дакументальны фільм пра яе «Дажыць да светлай паласы». Яе кінастужкі «Тры таполі на Плюшчысе», «Памяць сэрца», «Еўдакія», «Карнавал» знайшлі вялікі водгук у гледачоў, а тэлесерыял «Сямнаццаць імгненняў вясны» стаў на доўгія гады культавым. А пра тое, як яны ствараліся, дзе ў іх хаваюцца ноткі асобы рэжысёра, чаму не губляецца магія гэтых фільмаў праз гады — даведаемся ад самой Тацціны Міхайлаўны і яе калег. Калі цікава, то паглядзіце ў 14.30. А пасля запланаваны паказ драмы «Ім скараецца неба» (1963 г.).



Таццяна Ліознава зняла не толькі культавы серыял пра Шцірліца, але і не менш культавы фільм «Карнавал».

А вось на наступным тыдні 24 ліпеня з нагоды 90-годдзя акцёра тэатра і кіно, народнага артыста Беларусі Генадзя Гарбука (1934–2018 гг.) на тэлеканале «Беларусь 3» пакажуць кінастужку «Знак бяды». У драме, знятай на «Беларусьфільме» ў 1986 годзе па аднайменнай аповесці Васіля Быкава, артыст выступае ў галоўнай ролі. Не прапусціце сеансы ў сераду ў 13.10 і ў 21.05. А пасля ў 23.35 нас чакае аповед пра артыста ў праекце «Люблю і памятаю» (БТРК, 2020 г.).

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ

(«Звязда») Выпуск № 222

**№ 107**




№ 107 А. Баланюк ( г. Цеп-ладар Адэскай вобласці)

**Белыя простыя:** d2, f2, g3, b4, f4, h6 (6)

**Чорныя простыя:** h2, d4, a5, e5, d6, c7, g7, f8 (8)

№ 108 Ю. Мурадаў (Барысаў)

**Белыя простыя:** c5, d4, d6, g1, h2, h4, h6 (7)

**Чорныя простыя:** a5, b2, b8, d2, e3, f2, f4, f8, g3, g7, h8 (11)

№ 109 Я. Кандрачэнка (Гомель)

**Белыя простыя:** g1, f2, a3, c3, e3, a5, h6 (7)

**Чорныя простыя:** h2, c5, e5, d6, f6, g7, f8 (7)

№ 110 В. Арцюхін (Мінск)

**Белыя простыя:** h2, f4, c5, g5, b6, f6 (6)

**Чорныя простыя:** d2, f2, e3, e7, d8 (5)

Астатнія кампазіцыі па правілах бразільскіх шашак складзеныя вядучым рубрыкі.

**№ 111**

**Белыя простыя:** h2, b4, d4, f4 (4)

**Чорныя простыя:** f2, a5, e7, d8 (4)

**№ 112**

**Белыя простыя шашкі:** h2, c3, g3, b4, f4 (5)

**Чорныя простыя шашкі:** h4, a5, e7, d8 (4)

**№ 113**

**Белыя простыя шашкі:** b4, e5, d6, f6, h6, e7(6)

**Чорныя простыя шашкі:** f2, h2, a3, g3, c5 (5)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Знамянальныя даты: 70 гадоў таму, 10 ліпеня 1954 года, адбыўся першы чэмпіянат Беларусі па стаклетачных шашках.

Праверце свае рашэнні.

Выпуск № 221 ад 05.07.2024.

№ 100 1. e5-f6 g7:e5 2. d4:b6 c3:a1 3. b6-d4 a1:f2 4. e3:g1 a5-b4 5. e1-d2 b4-a3 6. d2-c3+

№ 101 1. f2-g3 h2:f4 2. d2-e3 d4:f2 3. e1:e5 f6:d4 4. h4:e5 g7-f6 5. e5:g7 h8:f6 6. g1-f2+

№ 102 1. f2-g3 a7:c5 2. e3-d4 c5:e3 3. e5-d6 c7:e5 4. g3-f4 e5:g3 5. c3-b4 a5:c3 6. b2:h8 h6-g5 7. h8-e5 f8-g7 8. e5:h8 g5-f4 9. h8-d4 f4-g3 10. a1-b2 g3-h2 11. d4-g1 d8-c7 12. b2-c3 c7-b6 13. g1:a7 h2-g1 14. c3-d4 g1:c5 15. a7:d4

№ 103 1 .d2-c3 b4:d2 2. g5-h6 e3:g5 3. h6:e1 h2:f4 4. e1-h4 c7-b6 [ 4...f4-g3 5. h4:b6 g3-h2 6. b6-g1 ] 5. h4:a5 f4-e3 6. a5-e1+

№ 104 1. f2-e3 f4:b4 2. h2-g3 h4:f2 3. b2-a3 e5:g7 4. a3:g1+

№ 105 1. a1-b2 a3:e3 2. d4:f2 g3:e1 3. a7-b8 e1:d6 4. b8:h2 f6-e5 5. h2:f8 h4-g3 6. f8-c5 g3-h2 7. c5-g1+

№ 106 1. b6-c7 b8:d2 2. g7-f8 e3:c5 3. f8:e1 h6-g5 4. g1:e3 g3-h2 5. e1-g3 h2:d2 6. c1:e3+

З лістоў чытачоў: «Дзякуем аўтарам і вядучаму за творчасць», — пішуць Ф. Карпей і Л. Жыхар.

Першымі дакладныя адказы даслалі: В. Арцюхін, Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе Мінск), С. Рашэцін (Ашмяны), В.Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна).

Пішыце па адрасе: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь Варушыла, майстар спорту.**





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Анонс

## ПРА ШТО РАСКАЖА ЛІПЕНЬСКІ НУМАР «АЛЕСІ»




### АБ ПРАФЕСІІ ВАДЗІЦЕЛЯ МАРЫЛА З ДЗЯЦІНСТВА

— Я не баялася дарогі і транспарту, — прызнаецца вадзіцель трамвая Валянціна Рудкоўская. — Памятаю, як аднойчы прыехала ў Мінск да цёткі ў госці і ўпершыню ўбачыла трамваі. Глядзела на іх з захапленнем. Менавіта тады вырашыла: «Вырасту — стану вадзіцелем трамвая!»

Тры разы фатаграфія Валянціны Васільеўны Рудкоўскай была на Дошцы гонару ў трамвайным парку. За амаль 30 гадоў у пасажырскім транспарце сталіцы жанчына атрымала не адну падзяку і ні разу не пашкадавала пра свой выбар, зроблены ў пачатку жыццёвага шляху. А шкадуе яна сёння толькі аб тым, што маладыя неахвотна ідуць вучыцца на вадзіцеляў грамадскага транспарту з-за складанасцяў прафесіі:

— Усё ж такі яна патрабуе якасцяў, з якімі, лічу, трэба нарадзіцца. Я адразу бачу, атрымаецца ў чалавека стаць добрым вадзіцелем ці не. І цяпер шмат хто з маіх вучняў паспяхова працуе.

### «ЧАСОПІС ДАПАМАГАЎ ЖАНЧЫНАМ СТАЦЬ АСОБАЙ»

Сёлета «Алеся» (раней — «Работніца і сялянка») адзначыць юбілей — 100 гадоў з дня выхаду першага нумара. Паэтэса, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Раіса Баравікова дзеліцца ўспамінамі пра легенду беларускай журналістыкі, былога галоўнага рэдактара выдання Марыю Карпенка і тлумачыць сакрэты паўтарамільённага тыражу «Работніцы і сялянкі». Выпісвалі часопіс па ўсім СССР.

— На 100-годдзі з дня нараджэння Ганны Ахматавай на Камароўскіх могілках, ля магілы паэтэсы я прачытала свае пераклады вершаў паэткі на беларускую мову. І якое захапленне было! Да мяне падыходзілі, казалі, што Ахматава неверагодна прыгожа гучыць па-беларуску. Таму не варта здзіўляцца, што беларускамоўны часопіс выпісвалі па ўсім Саюзе. СССР быў адзінай краінай, ва ўсіх яе куточках да беларусаў, іх культуры ставіліся з прыязнасцю, — адзначае Раіса Баравікова.

### «ПАДЧАС ДОЙКІ МЫ НАВАТ СПЯВАЕМ»

Аператар машыннага даення ААТ «10 з'езд Саветаў», што ў Чэрвеньскім раёне Мінскай вобласці, член Беларускага саюза жанчын, адна з пераможцаў рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2023» Алена Батурына любіць сваю працу, не баіцца цяжкасцяў, выхоўвае чацвярых дзяцей, клапоціцца пра ўнукаў і знаходзіць час для грамадскай дзейнасці.

— На мой погляд, каб спраўляцца з вялікім аб'ёмам спраў, усюды паспяваць і дамагацца поспехаў, трэба быць моцнай, цягавітай і працавітай, — лічыць Алена Батурына. — Таксама з упэўненасцю магу назваць сябе жыццярадаснай і вясёлай; імкнуся не маркоціцца і ва ўсім шукаю пазітыў.

### ЛЕГЕНДАРНАЯ ПАДПОЛЬШЧЫЦА

На гэтай вуліцы шырокія дарогі, шматпавярховыя дамы, Камароўскі сквер, фантаны і прыгожыя скульптуры. Тут заўсёды шматлюдна: прагульваюцца матулі з калясkamі, жыхары Мінска спяшаюцца на Камароўскі рынак за свежай садавінай і гароднінай. Вуліца знаёмая кожнаму мінчаніну, а названа яна ў гонар славутай дачкі беларускага народа Веры Захараўны Харужай, жыццё якой было сапраўдным подзвігам.

У час Вялікай Айчыннай вайны разам з таварышамі мужная патрыётка праводзіла дыверсіі супраць акупантаў на чыгунцы, збірала звесткі, дзе знаходзяцца склады і казармы гітлераўцаў. Дзякуючы народным мсціўцам, савецкая авіяцыя магла эфектыўна бамбіць размяшчэнне ворага, пазбаўляючы акупантаў гаручага, боепрыпасаў і тэхнікі. Жыццё Веры Харужай трагічна абарвалася ў 1942 годзе, калі яе схапілі фашысты.

### ТЭСТ НА САПРАЎДНАСЦЬ

Яна без малога паўстагоддзя стварае лекі і ў 70 гадоў не страчвае цікавасці да сваёй справы. Пераможца рэспубліканскага конкурсу «Жанчына года — 2023» у намінацыі «Не старэюць душой ветэраны», вядучы інжынер-тэхнолаг лабараторыі перапаральных і мяккіх лекавых форм упраўлення інавацыйнага развіцця Людміла Дунец 47 гадоў працуе на РУП «Белмедпрэпараты». Для яе роднае прадпрыемства без перабольшання — другі дом, за поспех якога яна хварэе ўсёй душой.

— Калі з вады і цвёрдых рэчываў атрымліваецца крэм, гель ці мазь, а з сумесі парашкоў — таблеткі, якія пазбаўляць тысячы, а можа, і мільёны людзей ад болю, дрэннага самаадчування, запалення, то зведваеш такую незвычайную радасць і душэўны ўздым, што не перадаць словамі! — прызнаецца суразмоўніца «Алесі».

### ГЛЕБА, НЕ СЫХОДЗЬ З-ПАД НОГ!

Многія ў сваім жыцці сутыкаліся з сітуацыяй, калі боль у спіне, у грудзях ці жываце не знаходзіла медыцынскіх абгрунтаванняў. Усе аналізы нібыта ў парадку, а лягчэй ад гэтага не становіцца. Або іншая гісторыя: з дзесяці пацыентаў з адным і тым жа дыягназам прызначанае лячэнне дзевяці дапамагае, а аднаму — не. Ва ўсіх гэтых выпадках з вялікай упэўненасцю можна казаць пра псіхасаматыку, якая вывучае ўплыў душэўных перажыванняў на ўзнікненне цялесных хвароб.

Хто і чаму часцей за ўсё пакутуе на псіхасаматычныя разладжванні? Якія метады звычайна выкарыстоўваюць для іх лячэння? Што кожны можа зрабіць для сябе, каб пазбегнуць праблем, якія патрабуюць працяглай тэрапіі? На гэтыя і іншыя пытанні адказвае галоўны навуковы супрацоўнік РНПЦ псіхічнага здароўя, прафесар Інстытута псіхалогіі БДПУ ім. М. Танка, доктар медыцынскіх навук Сяргей Ігумнаў.

### СМАЧНЫЯ СТРАВЫ, ЛЕТНІ АДПАЧЫНАК І ІНШАЕ

Акрамя гэтага, з часопіса вы даведаецеся, як прыгатаваць стравы грузінскай нацыянальнай кухні і ўладкаваць балкон пад зону адпачынку. Мы навучым, як самастойна зрабіць твар маладзейшым, а свой вобраз — больш жаноцкім і прывабным.

***Заставайцеся з «Алесяй» — з намі цікава!***

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**